*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*
*Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама*
*Аддзел адукацыі Шчучынскага райвыканкама*
*ДУА “Навучальна-педегагічны комплекс ”Першамайскі дзіцячы сад – сярэдняя школа”*

# Сказ аб зямлі Першамайскай



*Аграгарадок Першамайск*

# Летапіс населенага пункта

# Сказ аб зямлі Першамайскай

## Намінацыя "Сельскія населенныя пункты"

***Аўтары-складальнікі:***
***Гудач Наталля Іосіфаўна,*** *настаўніца гісторыі Першамайскага дзіцячага сада-сярэдняй школы*
***Дашкевіч Наталля Сцяпанаўна,*** *педагог-арганізатар Першамайскага дзіцячага сада-сярэдняй школы*

***Дызайн і вёрстка: Гудач Н.І.***

*Сказ аб зямлі Першамайскай: летапіс населенага пункта/ аўтары складальнікі: Н.І.Гудач, Н.С. Дашкевич. – Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Навучальна-педагагічны комплекс "Першамайскі дзіцячы сад – сярэдняя школа", 2011. – 36 с.*

*Краязнаўства з'яўляецца важным педагагічным сродкам патрыятычнага, духоўнага, працоўнага і эстэтычнага выхавання. У летапісе населенага пункта паказана сувязь школьнікаў з жыццём роднага края, з яго мастацкай і духоўнай культурай і з людзьмі. Краязнаўства садзейнічае далучэнню моладзі да пошукава-даследчай дзейнасці, творчасці, самастойнасці, пашырае магчымасці актыўнай прапаганды ведаў па гісторыі роднага краю і асаблівасцях яго сучаснага жыцця.*

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Навучальна-педагагічны комплекс*
*"Першамайскі дзіцячы сад –*
*сярэдняя школа"*
*231544 вул. .Школьная,1, аг.Першамайск,*
*Шчучынскі раён, Гродзенская вобласць*

***тэл. 8(01514) 35321 e-mail: perwom@mail.ru.***

## *ЗМЕСТ*

***Уводзіны***
***Раздзел 1. Кароткая характарыстыка прыродных умоў края***
***Глава 1.***_Рэспубліканскі ландшафтны заказнік “Котра”_
***Глава 2.***_Крыніцы Першамайшчыны_
***Глава 3.***_Водныя аб’екты мясцовасці_
***Раздзел 2.Вёска. Тандэм мінулага і сучаснасці***
***Глава 1.***_Гісторыя вёскі Сабакінцы або Ад Забалоцця да Першамайска_
***Глава 2.***_Археалагічныя помнікі_
***Глава 3.***_Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны_
***Глава 4.***_Ад калгаса “Першамайскі” да саўгаса “Першамайск агра”_
***Глава 5.***_Інфраструктура. сацыяльна-эканамічныя аб’екты вёскі_
***Раздзел 3.Установа адукацыі і помнікі архітэктуры***
***Глава 1.***_З чаго пачыналася Першамайская школа_
***Глава 2.***_Мясцовыя святыні_
***Раздзел 4.Вытокі народнай мудрасці***
***Глава 1.***_Песні, загадкі, прыказкі і прымаўкі_
***Глава 2.***_Слаўныя дзеячы зямлі Першамайскай_
***Заключэнне***



*ТЫ НАШ КРАЙ. ТЫ ЧЫРВОНАЯ ГРУША НАД ДЗЕДАЎСКІМ ДОМАМ,*
*ЛІСТАПАДАЎСКІХ ЗНІЧАК ГУСТЫХ ФАСФАРЫЧНАЯ РАЦЬ,*
*ТЫ - НАШ СЦЯГ, ШТО НІКОМУ, НІКОМУ НА СВЕЦЕ, НІКОМУ*
*НЕ ДАМО АБСМЯЯЦЬ, АПАГАНІЦЬ, ЗАБЫЦЬ, ЦІ МЯЧОМ ЗВАЯВАЦЬ.*
*МЫ КЛЯНЁМСЯ ТАБЕ БАРАЗНОЙ СВАЁЙ ПЕРШАЙ НА ПОЛІ*
*І АПОШНЯЙ РАЛЛЁЙ, НА ЯКУЮ ЎПАДЗЕМ У ЖУРБЕ.*
*МЫ КЛЯНЁМСЯ ТАБЕ, ШТО НІКОЛІ, НІКОЛІ, НІКОЛІ,*
*ТАК, НІКОЛІ НЕ КІНЕМ, НЕ КІНЕМ, НЕ КІНЕМ ЦЯБЕ.*



## *Уводзіны*

***“Каб зразумець сябе сапраўдным чалавекам,***
***уявіць прыналежнасць да свайго роднага,***
***беларускага, славянскага, разумець сваё месца ў***
***свеце, неабходна вывучаць народныя каштоўнасці,***
***тое, што стагоддзямі стваралі,***
***выкарыстоўвалі і захоўвалі нашы продкі”.***

*Калі гэту зямлю ўбачыш хоць раз у жыцці – не забудзеш. Калі з чыстых яе крыніц вып’еш глыток вады – прыбавіцца сіл і радасці. Калі пройдзеш па гэтай зямлі – палюбіш яе.*

*А калі нарадзіўся на гэтай зямлі, то дзе б не апынуўся, сэрца будзе неадступна клікаць да лясных і азёрных даляў, да духмянага чабору на ўзгорку ды жытнёвага поля. Будзеш бачыць родную зямлю то цяжкім коласам, то сенажаццю, то бульбай, спечанай у попеле вогнішча, заўсёды будзеш чуць яе песні – сумныя, вясёлыя, жаўрукова-радасныя, з маленства і на ўсё жыццё – родныя.*

*Населенныя пункты зямлі беларускай… Яны, як і людзі. У кожнага свой непаўторны твар, свой жыццёвы лёс, свае здабыткі. Адны славяцца старажытным мінулым, выключнай роляй у канкрэтных гістарычных падзеях. Другія – архітэктурнымі помнікамі, прыгажосцю сучасных збудаванняў. Трэція – дасягненнямі ў эканамічным развіцці, маладосцю…*

*Першамайскі край, непаўторны край, незабыўны край!*

*Вёска Першамайская з’яўляецца цэнтрам аднаіменнага сельскага Савета і саўгаса “Першамайск-Агра”. Па колькасці назваў у розныя часы нашу вёску можна занесці ў кнігу Рэкордаў. На працягу шасці стагоддзяў вёска змяніла 6 назваў: Забалацце, Сабакінцы, Сабокінцы, Нарбутова, Пакроўка, Першамайская. Вельмі доўгі час за вёскай была замацавана назва Сабакінцы. Многія старэйшыя жыхары нашай мясцовасці і сёння ўжываюць гэтую назву.*

*Адметнай рысай вёскі з’яўляецца тое, што яна знаходзіцца за 54 км. ад раённага цэнтра. Гэта самы аддалены куточак нашага раёна. Пагэтаму мала каму вядома яе багатае гістарычнае мінулае, яе сучаснае эканамічнае і культурнае становішча.*

*Таму гэту працу мы прысвячаем нашай роднай першамайскай зямліцы, яе прыроднай і непаўторнай прыгажосці, самабытнай культуры і сучаснасці, таму, хто яе праславіў і апеў, А зямліца нарадзіла, узгадавала і дала крылы для магутнага палёту многім нашым землякам: Цётцы, У.Рулю, Р.Бялячыцу, Т.Глушань, Т.Кашлей і іншым.*

*Каб пазнаёміць грамадскасць з гістарычнай спадчынай і сучасным становішчам першамайскага краю, мы, ўдзельнікі гуртка “Юны краязнавец” разам з кіраўніком паставілі для сябе мэту: пазнаёміць нашых землякоў і ўсіх шчучынцаў з цікавым мінулым нашага краю, пашырыць свой кругагляд і вызначыць малавядомыя адметнасці населенага пункта.*

*Здавалася, задача – невырашальная. Але паступова, крок за крокам, па крысе, мы набылі вельмі многа звестак пра наш край. Дапамаглі нам у гэтым матэрыялы школьнага гісторыка-краязнаўчага музея, сустрэчы з вядомымі землякамі, старажыламі вёскі і кіраўнікамі мясцовых вытворчых аб’яднаняў і грамадскіх устаноў.*

*Сабраны намі матэрыял быў сістэматызаваны па наступных радзелах:*

*1.Кароткая характарыстыка прыродных умоў краю;*

*2.Вѐска. Тандэм мінулага і сучаснасці (тапанімія, археалогія, інфраструктура);*

*3.Наш край у гады ваеннага ліхалецця*

*4.Вытокі вясковай мудрасці (забаўлялкі, прыказкі, жарты);*

*5.Спадчына маѐй вѐскі (фальклор, рамѐствы, землякі);*



## Раздзел 1. Кароткая характарыстыка прыродных ўмоў краю

***Клімат.*** *Па аграклiматычным раянаванні в.Першамайская адносіцца да ўмерана цёплага клімату. Тэмпературны рэжым характарызуецца наступнымі дадзенымі:*

*Вегетацыйны перыяд тут доўжыцца каля 195 дзён.*

*ЗІМА - гэты перыяд характарызуецца ўстойлівым пераходам сярэднесутачных тэмператур паветра праз 0 градусаў у бок паніжэння. Зіма доўжыцца ў сярэднім 116-126 дзён.*

*Найбольш халодным месяцам з'яўляецца студзень, сярэдняя тэмпература якога дасягае -5.5 градусаў. Зімы большай часткай няўстойлівыя і малоснежныя. Сярэдняя вышыня снежнага полага 10-12 см. Зімовыя ападкі складаюць 20-25% гадавы іх сумы або 180 мм.*

*У зімовы перыяд нярэдка назіраецца, калі ўстойлівага снежнага полага зусім не бывае, у сувязі з чым зімовыя культуры і шматгадовая трава падвяргаюцца вымярзанню.*

*ВЯСНА - перыяд пераходу тэмпературы праз 0 градусаў да пераходу праз +5 градусаў па сутнасці з'яўляецца перадвеснавым, бо ў плыні гэтага перыяду адбываецца інтэнсіўнае раставанне, ліквідацыя снежнага полага і адтаванне глебы. Канчаткова знікае снежны полаг да 1-8 красавіка. Вясна надыходзіць каля 10-15 красавіка, з моманту пераходу сутачных тэмператур паветра праз 5 градусаў цеплыні. У асобныя гады вясны бываюць пахаладанні і зацяжныя з частымі зваротамі халадоў, выпаданнем снегу, замаразкамі.*

*ЛЕТА - гэта перыяд абмежаванняў пераходамі сутачнай тэмпературы паветра праз 15 градусаў. Доўжыцца яго ў сярэднім 120-130 дзён. Летні перыяд пачынаецца 10-15 чэрвеня. Самы цёплы месяц ліпень +28 градусаў. У летнія месяцы ў сярэднім выпадае ад 200 да 300мм ападкаў.*

*ВОСЕНЬ. Надыходзіць у канцы жніўня, калі тэмпература паветра пераходзіць праз 15 градусаў у бок паніжэння і канчаецца 20 - 25 лістапада, калі тэмпература паветра пераходзіць праз 0 градусаў. Працягласць восені 80-90 дзён. Тэмпература паветра ўвосень паніжаецца ад дэкады да дэкады прыкладна на 2-3 градусу. Першыя замаразкі з'яўляюцца прыкладна ў кастрычніку часам у канцы верасня.*

*У в.Першамайская ў сярэднім выпадае 600-611 мм. ападкаў у год.*

***Раслiннасць.*** *Натуральны раслінны полаг вёскі ўтварае травы лугоў, балот, лясы, хмызнякі.*

***ГІДРАГРАФІЯ.*** *Маецца штучны вадаём карыснай плошчай 1500 кв. метраў.*

***РЭЛЬЕФ.*** *в.Першамайская па рэльефу ўваходзіць у заходнюю акругу беларускай грады. Тэрыторыя вёскі ставіцца да раёна, які тройчы падвяргаўся абляднененню.*

*Тэрыторыя яе ўяўляе сабой шырокавалністую раўніну з добра выяўленым мікрарэльефам у выглядзе паніжэнняў, а таксама невялікіх падвышэнняў.*

***ГЛЕБЫ***. *У адпаведнасці з кліматычнымі фактарамі і наяўнасцю лясной расліннасці асноўнымі глебаўтваральнымі працэсамі на тэрыторыі вёскі з'яўляюцца падзолістыя і дзярновыя. Таму тут распаўсюджаныя дзярновападзолістыя глебы слаба і сярэдне ападзоленные, якія ўтварыліся ў асноўным на мораных суглінках і супесках, часта на водналядніковых пясках.*

## *Глава 1.Рэспубліканскі ландшафтны заказнік "Котра"*



*Наш родны край. Ён прыгожы і па свойму адметны на поўначы і на поўдні, на ўсходзе і на захадзе.*

*Ён, наш край, прыгожы і непаўторны сваімі рэкамі і азерамі, сваімі лясамі і лугамі, сваімі сцежкамі і дарогамі.*

*Белавежская пушча і Браслаўскія азеры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач, Бярэзінскі запаведнік і заказнік « Котра», маленькія ручаі Пуціска і Скарбянка- усе гэта наш родны край, наша спадчына, якая аднойчы і назаўсёды даецца кожнаму чалавеку разам з жыццём.*

*Спадчына неацэнная. За ўсе даражэйшая. Але хто калі лічыў, хто калі задумаўся, колькі на душу насельніцтва, на душу кожнага з нас прыпадае кветак, матылеў, дрэў, птушак, крынічак. Усяго гэтага, мы занятыя вечнымі клопатамі, паўсядзеннаю працаю, часцей за ўсе не заўважаем- яно для нас такое звыклае і будзеннае, як і паветра. Гэты цуд прыроды!- якім мы безуважна, раўнадушна дыхаем.*



*Так, мы звыкла ўсім гэтым карыстаемся. Часам нават забываемся, што прырода- не толькі для нас адных, , хоць чалавек і з'яўляецца самаю лепшаю аздобаю любога краявіду. Беручы ў яе ўсё, чым яна так шчодра з намі дзеліцца, трэба думаць пра будучыню, абавязкова трэба пакідаць у ей месца і той жа рэчцы, і таму ж буслу, і той жа травінцы , і таму ж мурашу. Пакідаць усе, што ім трэба.*

*Бо усе мы на гэтай зямлі суседзі- рэчка і бусел, дрэва і травінка, кветка і пчала, мураш і чалавек. Усе мы зямляне. Бо зямля ў нас адна,*

*яна агульная для ўсіх. І мы маем радасць суіснаваць на ей. І жыць павінны ў дружбе і ва ўзаемнай павазе.*

*Таму беручы ў прыроды яе багацці, мы абавязаны захоўваць яе і павялічваць іх. Беручы- аддаваць.*

*Гэту старонку нашага летапісу мы прысвячаем прыродзе нашага першамайскага краю, так як менавіта тут, у навакольных лясах зусім нядаўна, 19 чэрвеня 2003 года Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь створаны* ***Рэспубліканскі ландшафтны заказнік "Котра".*** *Агульная плошча заказніка складае 10584,5 гектараў.*

*Заказнік створаны з мэтай захавання каштоўных ландшафтаў і раслінных аб'яднанняў, якія ствараюць уцэлым адзіны прыродны комплекс з заказнікам "Чапкуляй" Літоўскай Рэспублікі. Тэрыторыя заказніка ўключана ў Спіс водна-балотных угоддзяў міжнароднага значэння.*

*Тэрыторыя заказніка знаходзіцца ў вярхоўях ракі Котра (басейн р.Нёман) і мяжуе з літоўскім запаведнікам "Чапкуляй". Лясы, пераважна хвойнікі, растуць на балотах і займаюць каля 91 % ад агульнай плошчы ўгоддзяў. Балоты (верхавыя, пераходныя і нізінныя) размешчаны ў асноўным у міжградавых паніжэннях, лагчынах і пойме ракі Котра. У пойме знаходзяцца і амаль усе лугі, якія займаюць каля 5% тэрыторыі. У цэлым доля пераўвільготненных тэрыторый складае больш за 40 % плошчы заказніка.*



*Асноўным вадацёкам тэрыторыі з'ўляецца рака Котра, якая працякае ўздоўж паўночнай мяжы заказніка. Котра дрэніруе большую частку аднаіменнага заказніка і запаведніка "Чапкуляй". Даўжыня ракі ў межах заказніка складае 35 км., шырыня – 10-20 метраў.*



*Рэчышча вельмі звілістае, утварае петлі, пратокі, старыцы, невялікія але глыбокія пойменныя азёры. Плынь ракі слабая, шырыня нізкай, роўнай поймы вар'іруе ад 500 да 800 метраў. Практычна ўсе рэкі заказніка (Скарбянка, Пуціска, Нізянка) каналізаваны на ўсім працягу, у іх упадае вялікая колькасць меліярацыйных каналаў. У цэлым меліярацыйная*

*сетка страціла сваё гідрарэгулюючае значэнне, каналы зарастаюць драўлінай і хмызняковай расліннасцю, перагароджанны бабровымі плацінамі.*

*Асноўным відам землекарыстання заказніку з'яўляецца лясная гаспадарка. Вядзецца рэгламентаваннае паляванне. У лясах мясцовае насельніцтва збірае грыбы і ягады. Адкрытыя тэрыторыі выкарыстоўваюцца галоўным чынам у якасці сенакосаў.*

*Вялікая разнастайнасць прыродных экасістэм стварае тут спрыяльныя ўмовы для існавання тут шматлікіх відаў раслін, у тым ліку і рэдкіх.*



*На гнездаванні ў заказніку адзначана каля 89 відаў птушак, пераважна лясных, што абумоўлена высокай лясістасцю тэрыторыі. Тут шмат арабка цецярука, глуішча, слонкі, вялікага голуба.*

*З відаў, занесенных у Чырвоную кнігі Беларусі, на гнездаванні ў заказніку адзначаны чорны бусел, звычайны гогаль, шэры жуŭравель, малы арлец, пугач, касматаногі сыч, зялёны дзяцел, жоўтагаловы дзяцел, вялікі грычун. Акрамя таго, у заказніку гняздуюцца віды, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знікнення: дубальт і драч.*



*У складзе флоры адзначаны 633 віды вышэйшых сасудзістых раслін, 14 з іх (купальнік горны, пустапялёснік зялёны, пальчаткакарэннік балтыйскі, зубніца клубняносная) належаць ахове. Яшчэ 17 відаў раслін патрабуюць прафілактычнай ахове і рацыянальнага вык арыстання.*



*Сярод млекакормячых выяўлены амаль усе каштоўныя ў паляўніча-гаспадарчых адносінах віды жывёл: янотападобны сабака, ліса, воўк. Рака Котра і сістэма меліярацыйных каналаў заселены бабром і андатрай. У пойме ракі зрэдку сустракаецца выдра. Два віды млекакормячых – рысь і барсук – занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.*

## *Глава 2. Крыніцы Першамайшчыны*

*Ва ўмовах узрастаючага ўздзеяння на прыроду, пагаршэння экалагічных абставін асобае значэнне надаецца ўліку і ахове найбольш ўразлівым аб’ектам. Да іх, без усякага сумнення, адносяцца крыніцы. Ніхто не падлічыў, колькі ўсяго крыніц налічваецца на тэрыторыі вобласці. Ды гэта і немагчыма зрабіць, таму што крыніцы могуць то знікнуць, то зноўку з’явіцца. Адны з іх вядомы толькі ў тых месцах, дзе струменьчык прабіўся на белы свет, а аб другіх ведаюць за межамі вобласці.*



*В ымаўляеш слова “ крыніца” , “ раднік “ - і ў памяці вырысоўваецца карціна цішыні дрымучага лесу ў сонечны ранак, дзе скрозь лісце дрэў прабіваюцца цеплыя праменьчыкі. Унізу прахалода, тонкім звінячым струменьчыкам ад крыніцы бяжыць рачулка. Абмыўшы карэнні дрэў, яна бяжыць далей, паступова ператвараючыся ў паўнаводную раку альбо возера. Мала хто задумваўся, што жыцце і гэтай рэчкі, і гэтага возера звязана з маленькай крынічкай. У лясной цішы раздаецца яе звонкі крыштальны голас. “Клюю! Клюю!” – чуецца ў яго журчанні.*

*Крынічная вада крыштальна чыстая, прыемная на смак. У ёй няма ўзбуджальнікаў шкодных для здароўя чалавека. Напэўна таму, ваду многіх крыніц лічаць святой. Часта крыніцы з’яўляюцца аб’ектамі экалагічнага і аграрнага турызму. Уключыўшы крыніцы ў склад турысцкіх маршрутаў, праграма робіцца больш цікавай і разнабаковай. Беларускія крыніцы валодаюцы вялікім культурным і духоўным патэнцыялам. Наш народ ва ўсе часы адрознівала беражлівыя , а дзе нават і благагавейныя адносіны да крыніц. Засмечванне крыніц лічылася святататствам. Тых жа , хто абсталёўваў , раскопваў крыніцы, паважалі ўсе. У фальклорных творах есць многа звестак аб крыніцах, іх прыгажосці, жыватворнай сіле.*

*Навука тлумачыць паяўленне крыніц выхадам вод на паверхню.*



*Вывучэннем крыніц у ваколіцах вескі Першамайская заняліся і мы, вучні Першамайскага дзіцячага сада – сярэдняй школы. Мы выкарыстоўваем розныя формы атрымання інфармацыі : апытванне старажылаў, гутаркі з бацькамі, так як звестак аб наяўнасці крыніц ў нашай мясцовасці нідзе няма. Дапамогу нам ў выяўленні*

*крыніц аказваюць супрацоўнікі Рэспубліканскага заказніка “ Котра”: дырэктар Люткевіч Т.І.. і вядучы спецыяліст Вербаль С.І.*

*Са слоў старажылаў мы даведаліся, што ў мінулыя гады ваколіцы нашай мясцовасці былі вельмі забалочаны. Было многа крыніц. Грунтовыя воды падыходзілі блізка да паверхні.*

*У выніку праведзенай работы мы атрымалі звесткі аб наяўнасці пяці крыніц, але аказалася , што трох крыніц ў цяперашні час ужо няма. Яны зніклі ў выніку праведзеных у данай мясцовасці міліярацыйных работ. Адна з існуючых крыніц знаходзіцца ў натуральным, непарушаным стане, другая – абсталявана бетонным кальцом дыяметрам 120см. Кожная з існуючых крыніц своеасаблівая і непаўторная.*

***<u>Апісанне крыніцы, якая знаходзіцца на паўднёвым захадзе вескі Першамайская.</u>***

*Крыніца знаходзіцца каля сядзібы грамадзяніна па прозвішчу Дубінка. На адлегласці 300м. ад маста па правы бок за вескай Першамайская. Крыніца абсталявана бетонным кальцом, дыяметрам 120см. Кальцо запоўнена вадой, Узровень вады-83 см. З боку кальца выбіты жалабок для стоку вады. Дно ў калодзежы ілістае. Сценкі калодзежа пакрыты зялёным налётам водарасцей. Тэмпература вады ў калодцы складае +8 градусаў.*



*Вада без паху, але мутная, выкарыстоўваць для піцця немагчыма. Струменьчыка вады,сцякаючага з жалабка, не відаць. Гэта гаворыць аб тым , што крынічка спыніла свае існаванне . Аб ёй напамінае толькі калодзеж, ў які яна была заключана, і аповеды жыхароў вескі. З расказаў прадстаўнікоў агранамічнай службы саўгаса “Першамайск-агра” мы ўстанавілі, што крыніца спыніла свае дзеянне ў выніку праведзенай міліярацыі на дадзенай тэрыторыі і паніжэння грунтовых вод. Негатыўны ўплыў на даную крыніцу аказала сельскагаспадарчая дзейнасць КСУП “ саўгас “ Першамайск-агра” і выпас жывелы мясцовым насельніцтвам. Мы прышлі да высновы : памылкова лічыць , што крыніцы існуюць вечна. Без вопытнага кансультанта лепш не прымаць ніякіх дзеянняў. Крыніца складанае і вельмі хрупкае прыроднае ўтварэнне, і любое некваліфікаванае ўмяшанне можа стаць для яе ракавым.*

***<u>Крыніцы рэчкі Пуціска</u>***

*Старажылы вескі Першамайская расказваюць, што рэчка Пуціска, ўзяўшая свой пачатак каля хутара Кажанеўскіх, пражываючых за*

*вескай Табалічы, працякала па балоцістай, заросшай кустарнікамі мясцовасці.*



*Цячэнне яе было павольным , берагі палогія. Кожны раз пасля вялікіх навадненняў яе шлях змяняўся, водны паток рабіў сваю спрадвечную работу. Шлях сабе яна ўтварала сама. Але прышлі меліяратары, правялі дрэнажныя работы на дадзенай тэрыторыі. Паглыбілі рэчышча ракі. Уціснулі яе рэчышча ў даволі крутыя берагі. Злучылі яе з дрэнажнымі канавамі, вадой якіх напаўняецца яна ў цяперашні час. Старажылы мяркуюць , што і назва ракі адпавядае яе сённяшняму жыццю: блытаецца яна па тэрыторыі, сціснутая даволі стромкімі берагамі , покуль данясе свае воды да ракі Нявіша. Праведзеная меліярацыя прывяла і да таго, што многа крыніц спыніла свае існаванне на дадзенай тэрыторыі і толькі рэчка Пуціска стала іх сховішчам на сённяшні дзень. Прайшоўшы па цячэнню ракі, заўважаеш, як з днішча рэчышча ўздымаецца водны струменьчык.*



*У тых месцах, дзе ўзровень вады значна паніжаецца, струменьчык нават выходзіць на паверхню вады. Гэтыя водныя струменьчыкі чыстыя, халодныя. У цяперашні час яны здавольваюць смагу пастухам.*

## *Глава 3. Водныя аб'екты мясцовасці*
## *Геаграфічнае апісанне возера Першамайскае*



*Возера Першамайскае размешчана ў пачатку вѐскі. Мае V- падобную форму. Утварылася ў выніку выкопвання катлавана. Працягласць складае каля 148,5 м у даўжыню і 80 м ушырыню. Характар берагоў раўнінны. Глыбіні возера вагаюцца ад 1,8 м да 2,5 м. Максімальная глыбіня складае месцамі да 2,5 м (месца працякання рэчкі). Характэрны упадаючыя і выцякаючыя воды. Цячэнне сцѐкавае. Прэснае. Выкарыстоўваецца чалавекам для гаспадарчых патрэб. З'ўляецца*

*месцам адпачынку людзей match рознага ўзросту і ў самыя розныя поры года. А таксама духоўнага абагачэння людзей.*

*Гістарычная даведка:*

*Возера Першамайскае – штучны вадаём. Створаны ў 1964 годзе для асушкі забалочанай тэрыторыі. Выцёк асноўнай ракі Пуціска пачынаецца з в.Табалічы (за хутарам Кажанеўскіх). Мае працяг да в.Красная і ўпадае раку Нявіша. Другі рукаў злучаецца з дрэнажнымі канавамі.*



*Праз тэрыторыю в.Першамайская прадаўжае сваё цячэнне і рака **Скарбянка.** Шырыня ракі 8 метраў. У 100 метраў ад ракі ўлева пачынаецца лес. Па баках ракі прыгожы луг. Берагі ракі моцна заросшыя высокай крапівой, берагі высокія. У рэчцы многа апалага лісце. Рака далей цячэ ў лесе. І прыблізна праз 4000 метраў рака Скарбянка становіцца Чэрняй. Чаму Чэрня? Існуюць меркаванні, што яна называецца так, таму што вада ў раццэ чорнага колеру, а чорная яна ад апалага лісце і ад тарфянога дна. Але гэта толькі меркаванні.*

***Легенда аб паходжанні назвы ракі Скарбянка***

*Даўным – даўно ў нашых краях жыла прыгожая дзяўчына. Яе красой захапляліся ўсе, хто хоць раз дзяўчыну абачыў. Больш за ўсе любіла прыгажуня гуляць на беразе безымяннай рэчкі, якая працякала непадалёк ад яе дома. Аднойчы дзяўчына рвала на лужку каля ракі рознакаляровыя кветкі, сплятала іх у вянок, азіраючы, як плёскаюцца ў вадзе рыбкі. І тут бачыла яна незвычайна прыгожую кветку з белымі пялёсткамі, якая падымалася проста з вады. Дзяўчына спрабавала дацягнуцца да яе і арваць, але слізгануў з мокрага пальца ў ваду залаты пярсцёнак, што падарыў ёй каханы, адыходзячы на вайну. Горка плакала красуня, але дастаць пярсцёнак ніхто не змог. Толькі ж хто ні падыходзіў да гэтага месца, кожны бачыў , як у блакітнай глыбіні зіхацеў той пярсцёнак пад струменямі ракі. Здавалася, там цэлы скарб ляжыць. Паспрабуе хто залезці ў ваду – нічога не знаходзіць, а як асядзе каламуць – ізноў блішчыць золата. Жыве Скарбянка, жыве і легенда.*



## *Раздзел 2. Вѐска. Тандэм мінулага і сучаснасці*

### *Глава 1.Гісторыя вѐскі Сабакінцы або Ад Забалоцця да Першамайскай*

*Прыйдуць людзі….*
*І спытаюць Нас.*
*"Скуль, якога Вы роду?*
*Дзе зямля ваша будзе,*
*Дзе Айчына ў Вас?"*

*Сучасная вёска Першамайская вядома з **XV ст**. Першапачатковая назва яе было Забалацце. Назва добра адлюстроўвала прыродныя асаблівасці гэтай мясцовасці, але стварыла путаніцу. Справа ў тым, што ў дзесяці кіламетрах ад в. Першамайская размяшчалася мястэчка Забалаць у сучасным Воранаўскім раёне. Пагэтаму, калі ў 1550 годзе в. Забалацце была перададзена перабежчыку з Масквы баярыну Міхаілу Сабакіну, то, мясцовае паселішча сталі называць вёскай Сабакінцы. Пад назвай Сабакінцы вёска праіснавала больш за 300 гадоў, нават некаторы час лічылася мястэчкам.*

*У другой палове XVIII ст. грубая мужыцкая назва Сабакінцы не стала ўспрымацца шляхтай, так як на іх паўздзейнічала захапленне антычнай культурай і французскае асветніцтва. Каб надаць Сабакінцам больш ласкавую назву шляхта пачала выкарыстоўваць новую форму – Сабокінцы. Але сяляне не разумелі польскай мілагучнасціі і выкарыстоўвалі былую назву Сабакінцы.*

*У 60-я гады XIX ст. з боку праваслаўных свяшчэннікаў з'явілася прапанова пераіменаваць Сабокінцы ў сяло Пакроўскае ці проста Пакровы (старая назва мясцовай царквы пакровы Прысвятой Багародзіцы). Гэта прапанова абмяркоўвалася амаль 30 гадоў, пад час якіх мястэчка называлася ці Пакроўскім, ці Сабокінцамі. У верасні 1899 года губернскае праўленне ў Вільні канчаткова замацавала новую назву – Пакроўскае.*

*Не паспела паселішча прывыкнуць да новай назвы, як пачаліся Першая сусветная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя, у выніку якіх Шчучыншчына стала часткай Польскай дзяржавы. Навыя ўлады адразу адказаліся ад назвы Пакроўская і вярнуліся да старой назвы Сабокінцы.*

*Але ў хуткім часе польскім уладам таксама не спадабалася назва Сабокінцы, і ў сярэдзіне 30-х гадоў XX ст. з'явіўся праект пераіменаваць Сабокінцы ў Нарбутова – у гонар аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гадоў Людвіга Нарбута.*

*2 ліпеня 1939 года адбылося ўрачыстае свята ў гонар прысваення мястэчку новай назвы – Нарбутова. Не паспела высахнуць фарба на*

*свежых шыльдах, як у верасні 1939 года пачалася Другая сусветная вайна, першай ахвярай якой стала Польшча. Не прабыўшы і трох месяцаў назва Нарбутова зноў была пераіменавана ў Сабакінцы.*

*Пад такой назвай населенны пункт перажыў цяжкія ваенныя гады і быў вызвалены савецкімі войскамі 12 ліпеня 1944 года.*

*У пачатку пяцідзесятых гадоў была звернута ўвага на не ўмесную назву аднаго з сельскіх Саветаў – Сабакінскі. Каб вырашыць гэтае прытанне ў 1954 годзе вёска Сабакінцы была пераіменавана ў вёску Першамайская, а мясцовы сельскі Савет стаў Першамайскім.*

*Новыя назвы былі мелагучнымі і яскрава савецкімі. Так па сённяшні дзень існуе добра ўсім вядомая вёска Першамайская.*

*Такім чынам, на працягу сваёй 500 – гадовай гісторыі сучасная вёска Першамайская змяніла 6 назваў:*

*Забалацце*
*Сабакінцы*
*Собокінцы*
*Пакроўскае*
*Нарбутова*
*Першамайская*

*Няхай ведаюць нашых!*

## ***З гісторыі роднай вёскі (легенды)***

*Першамайск. Сапраўды, ці з прадвеку называлі так прыгожую вёску на Шчучыншчыне. Не. Да гэтага наша вёска мела шмат цікавых назваў. Існуе некалькі легенд, якія тлумачаць паходжанне нашай вёскі: 1. За паспяховуі і добрую службу у баі з Паўднёва-Усходнімі плямёнамі гэтыя месцы, дзе былі лясы падараваны царом падпалкоўніку па прозвішчы Сабакін. І ў 1450 годзе падпалкоўнік, у якога быў маёнтак яшчэ дзесьці ў цэнтры Расіі, прыехаў у гэтыя мясціны для агляду мясцовасці. На месцы Першамайска была невялікая, але вельмі прыгожая дубовая мясцовасць. Ён вырашыў паставіць хаціну для прыезду на паляванне. Для атрымання такой пабудовы падпалкоўнік пасяліў тут сваю сям'ю, назваў гэту мясціну ад свайго прозвішча Сабакіна. З 1450 года стала пабольшвацца насельніцтва. (гэтыя звесткі ўзяты з журнала "Зямля")*

*Другая легенда тлумачыць назву вёскі так:*

*Там, дзе цяпер бальніца жыла пані, якая мела псарню каля ста сабак. Сабакі кідаліся на людзей, і пагэтаму вёску назвалі Сабакінцамі.*

*А вось і трэці варыянт: За тое, што жыхары выступілі супраць царызму, царскі генерал Мураўёў загадаў назваць вёску Сабакінцамі, ад слова сабака.*

*2. Другая назва вёскі тлумачыцца так:*

*У цэнтры вёскі знаходзілася Пакроўсккя царква, якая была названа ў гонар свята "Пакрова". Ад гэтага вёска была названа Пакроўскай.*

*3. Трэцяя назва вёскі:*

*У час паўстання 1863-1864 гг. кіраўніком паўстанчага атрада на нашай мясцовасці быў Людвіг Нарбут. У яго гонар вёска была названа Нарбутова. Гэтыя зведкі былі атрыманы ад вясковых старажылаў.*

*З 1954 г. вёска атрымала назву Першамайская, у гонар свята Першага Мая. Так завецца яна і сёння.*

## *Глава 2. Археалагічныя помнікі*
## *Каменны могільнік урочышча "Дуніч-Магіліцы".*

*Чалавек без памяці – паталогія. Такі ж хворы і народ, які не ведае свайго мінулага, страціў гістарычную памяць. Народ без такой памяці не мае будучыні. Ён раней ці пазней знікне сярод больш згуртаваных суседзяў.*

*Таму так важна ведаць, адкуль мы на гэтай зямлі, які адолелі шлях, калі перамагалі і дзе памыляліся, каб вопыт продкаў асвятляў нам кірунак ў будучыню. Вытокі гісторыі мясцовага народа – у цѐмнай бездані тысячагоддзяў.*

*Таму здаецца, што сляды мінулых пакаленняў зацерліся ў бяспамяцтве, зніклі на заўсѐды. Але ж нічога чалавечага, колісь жывога, не прападае без астатку, нават са старажытнейшых дапісьмовых часоў. Толькі трэба быць дапытлівымі і уважлівымі, адчуваць душою повязь эпох, і тады зямля пачне адчыняць свае таямніцы, і продкі нагадаюць пра сябе каменнай прыладай, знойдзенай дзе-небудзь на рачным беразе, абломкам глінянага посуду, стромкімі схіламі гарадзішчаа, курганамі. І паўстаюць перад табою вобразы даўнія Краю…*



*У межах Шчучынскага раѐна на сѐнняшні дзень налічваецца каля 20 каменных могільнікаў, але, вядома, вывучаліся толькі некаторыя з іх. Каля нашай вѐскі раскопкі **могільніка урочышча Дуніч-Магіліцы** праводзіў у 1891 годзе В.А.Шукевіч. Ён раскапаў тут 8 магіл. Магільнік знаходзіўся ў лесе, а таму магілы на паверхні былі амаль нябачныя. Як адзначаў даследчык, камянѐў было мала. Глыбіня магільных ям ад 0,8 да 1,2м. У дзвюх магілах шкілеты былі абстаўлены дошкамі. У жаночых пахаваннях знойдзены: кольцападобныя з перавіццѐм і ў форме пытальніка завушніцы,*

*пярсцѐнкі, дзенарый Аляксандра Ягелончыка (1501-1506гг.). У мужчынскіх пахаваннях выяўлены: крэсівы з крэмнямі, сякеры, жалезныя нажы, спражкі, дзенгарый князя Вітаўта (1401-1430гг.). Пахавальны інвентар дазваляюць датаваць помнік XIV-XVIстст. Праведзеныя даследаванні паказваюць, што на працягу значнага часу прасочваецца пераемнасць пахавальных традыцый і іх цэласнасць. Гэта можа сведчыць аб тым, што зменаў насельніцтва мясцовасці не адбывалася.*

### Глава 3.Наш край у гады ваеннага ліхалецця

*Няма на Беларусі такога кутка, які б не стаў месцам здзяйснення народнага подзвігу. І няма месца, дзе не шанавалі б гэтыя подзвігі. Абеліскі і помнікі, мемарыяльныя комплексы, Курганы Славы. Каля падножжа многіх з іх Вечны агонь. Яны раскрываюць веліч подзвігу людзей у імя свабоды і незалежнасці Радзімы, з'яўляюцца часткай духоўнага жыцця нашага грамадства. Сярод іх шмат такіх, якія вядомы ва ўсім свеце.*

*Нізка схіляем галовы перад памяццю герояў, якія зрабілі ўсѐ для нашай свабоды, шчасця і светлай будучыні. Гэта памяць кліча нас, сыноў, унукаў і праўнукаў адважных байцоў, быць дастойнымі іх славы. У сваім мінулым народы заўжды шукаюць тую крыніцу, якая здольна ўмацоўваць духоныя сілы. Памяць патрэбна жывым, каб гледзячы на веліч былога, будаваць заўтрашні дзень.*

*Ведаць гісторыю сваѐй краіны – найсвяцейшы абавязак кожнага сапраўднага грамадзяніна Беларусі. Патрыятызм з'яўляецца асновай мужнасці, доблесці і моцы. Дзякуючы яму беларускі народ вынес суровыя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення, змог адстаяць незалежнасць.*

*Гэта старонка нашага летапісу дапаможа нам атрымаць больш шырокія веды аб трагічных і гераічных старонках ваеннага мінулага нашай мясцовасці; дапаможа здзейсніць экскурсію па памятных мясцінах Першамайска, звязанных з барацьбой жыхароў нашай мясцовасці супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў; дазволіць непасрэдна дакрануцца да старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; умацуе пачуццѐ павагі да роднай зямлі і гонару за сваіх мясцовых жыхароў.*

*Зварот да мінулага, яго трагічных старонак – справа павучальная і неабходная для таго, каб не паўтарыць папярэдніх памылак.*



*У цэнтры вѐскі Першамайская знаходзіцца нічым непрыметны на першы погляд будынак. Але ѐн мае вельмі цікавую ваенную гісторыю. У час Вялікай Айчыннай вайны ў будынку размяшчалася нямецкая камендатура і гестапа. Тут знаходзілася вышэйшае нямецкае камандаванне. А некаторыя ўнутраныя памяшканні будынка выкарыстоваліся для катавання і допыту мясцовых жыхароў і партызан. Насупраць стаяў нямецкі гарнізон. Успаміны удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны сведчаць а тым, што ад будынка і да возера быў пракапаны глыбокі падземны тунэль, па якім немцы вадзілі на растрэл палонных партызан ці мясцовых жыхароў, якія не жадалі падпарадкоўваца новай уладзе.*

*Дзейнічаў на тэрыторыі Першамайскага с\с і "новы парадак". Жыхарам было забаронена з'яўляцца на вуліцы пасля 9 гадзін вечара, паліць у хаце святло. Нават забаранялася размаўляць суседу з суседам.*

***Спіс нашых землякоў, якія былі закатаваны ў гэтым будынку ў перыяд нямецкай акупацыі:***

*1.Кімашэўскі С. – в.Першамайская*
*2.Пархуцік М.П. – в.Матылі*
*3.Пархуцік М.Т. – в.Матылі*
*4.Антухевіч Ф.С. – в.Матылі*
*5.Янковіч К.А. – в.Матылі*
*6.Янковіч В.В. – в.Матылі*
*7.Пячурчык В.А. – в.Хадзілоні*
*8.Пячурчык І.С. – в.Хадзілоні*
*9.Пячурчык А. С. – в.Хадзілоні*
*10.Пячурчык В. – в.Хадзілоні*
*11.Русак А.В.– в.Хадзілоні*
*12.Русак В.А. – в.Хадзілоні*
*13.Русак А. – в.Хадзілоні*
*14.Пячурчык А. І. – в.Хадзілоні*
*15.Пячурчык І. – в.Хадзілоні*
*16.Вайцяховіч В.– в.Хадзілоні*
*17.Утаўка А.С. – в.Хадзілоні*
*18.Утаўка Ю. С. – в.Хадзілоні*
*19.Якімчык Ю. – в.Хадзілоні*
*20.Воўчак С.М. – в.Хадзілоні*
*21.Пячурчык П.С. – в.Хадзілоні*
*22.Бельскі В. – в.Хадзілоні*
*23.Міхневіч В.А. – в.Хадзілоні*
*24.Шылка А.А. – в.Хадзілоні*
*25.Адамовіч С.Р. – в.Хадзілоні*
*26.Вайцяховіч І.А. – в.Хадзілоні*
*27.Палуян Я.А. – в.Падгалішкі*

***Брацкая магіла у в. Першамайская***

*Тысячы помнікаў і абеліскаў, на якіх высечаны прозвішчы загінуўшых герояў, увекавечваюць памяць аб воінах Чырвонай Арміі, партызанах і падпольшчыках. Пад тысячамі абеліскаў па ўсѐй беларускай зямлі*

*вечным сном спяць мільёны тых, хто не вярнуўся з вайны. І пакуль б'юцца нашы сэрцы, мы не маем права ў паўсядзённых радасцях і клопатах забыць пра іх подзвіг.*



*У цэнтры нашай вёскі размяшчаецца таксама* ***абеліск,*** *які з'яўляецца сімвалам нашай памяці і гонару за гераічны подзвіг нашых землякоў у гады вайны. Абеліск пастаўлены у 1975 годзе. Тут знаходзяцца брацкія магілы трох невядомых партызан з атрада генерал - маёра П.П.Капусты; васьмі мірных жыхароў, расстраляных у 1943 годзе гітлераўцамі: Альбертскі Уладзіслаў, Альбертская Марыя Якаўлена, сын Бартош, дачка Крыстына, Кухарскі Іосіф, Пашынская Таццяна, Бушман Адам, Палтарацкая Алена.*

*Тэкст надпісу на помніку: «Вечная слава павшим в боях с немецкими захватчиками за свободу нашей Родины 1941 – 1945 гг.»*

*З музейнага матэрыялу мы атрымалі гэтак жа звесткі аб дзейнасці на тэрыторыі Першамайскага с\С і* ***партызанскага атрада імя Катоўскага брыгады імя Ленінскага Камсамола.*** *Камандзірам атрада быў выбраны Еўдакімаў Іван Раманавіч.*

*У гады Вялікай Айчыннай вайны на акупаванай ворагам савецкай тэрыторыі бушавала полымя ўсенароднага партызанскага руху. Ужо ў першыя месяцы вайны на тэрыторыі цяперашняй Гарадзенскай вобласці з'яўляюцца партызанскія групы, ствараюцца падпольныя антыфашысцкія арганізацыі, групы, у якія ўваходзілі партыйныя савецкія актывісты, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, трапіўшыя ў асяроддзе або ўцекачы з палону камсамольцы, беспартыйныя.*



*У верасні 1943 года з партызан 1-го і 3-го ўзводаў атрада імя Ленінскага Камсамола сфарміраваны атрад імя Катоўскага. Камандзірам атрада быў прызначаны Еўдакімаў Іван Раманавіч. Камісарам атрада стаў М.У.Міхалёў, начальнікам штаба - спачатку І.І.Маргуліс а затым Н.У.Ямін, начальнікам разведкі - І.І.Іоніс, упаўнаважаным адмысловага аддзела - У.Н.Стасюкевіч.*

Колькі іх было, ваенных аперацый? 18 баёў з гітлераўцамі, 14 пушчаных пад адхон эшалонаў, 6 падарваных мастоў! Аб гэтым распавядаюць дакументы і матэрыялы.

№225. "З баявога часопіса партызанскага атрада імя Ленінскага Камсамола аднайменнай брыгады Барановіцкай вобласці аб дзейнасці партызанскіх груп у раёнах Барановіцкай і Беластоцкай вобласці з 21 траўня па 7 лістапада 1942 гады. 3 ліпеня 1942 г. групай партызан у складзе 10 чалавек пад кіраўніцтвам Еўдакімава І.Р. разбітая Каспіроўская гміна і Зіновічаскі маслазавод Васілішкоўскага раёна.
У выніку ў гміне знішчаныя ўсе дакументы, узята грошай 15 тыс. рублёў і пішучая машынка. На маслазаводзе знішчаная сепараторная машына, узята масла сметанковае 93 кг., узята і знішчана смятаны 800 літраў і малака 250 літраў. У аперацыі ўдзельнічалі: Еўдакімаў І.Р., Будзка К.І., Любецкі Е., Варабейчык А., Варабейчык Б., Почтар М., Маргуліс І., Мендзялевіч Х., Мендзялевіч Ш., Дубчанскі М.
15 кастрычніка 1942 гады групай партызан у складзе 6 чалавек пад кіраўніцтвам камандзіра групы Еўдакімава І.Р. Знішчаныя Валадарская гміна і маслазавод Радунскага раёна, у выніку - у гміне знішчаныя ўсе дакументы і бланкі. На маслазаводзе знішчаная сепараторная машына, узята і раздадзена сялянам малака 200л. і смятаны 50л."



Да снежня 1942г. партызанская група вырасла да 70 чалавек, за рахунак мясцовага насельніцтва і цекачоў з нямецкага палону салдатаў і афіцэраў Савецкага войска. Менавіта ў гэты час патрапіў у групу і Грымута Мікалай Іванавіч, жыхар в. Першамайская. Калі немцы сталі арыштоўваць усіх актывістаў Савецкай улады, ён не стаў чакаць сваёй чаргі і стаў хавацца ў лесе. І тут ён сустрэўся з групай камандзіраў і байцоў Чырвонага войска, якія апынуліся ў асяроддзі. Пазнаёміліся, дамовіліся аб сумесных дзеяннях. Месцам стаянкі абралі ўрочышча "Ваўчыныя норы". Тут пабудавалі зямлянкі, у якіх размясцілі параненых і партызан. У сувязі з павелічэннем групы наспела пытанне аб арганізацыі партызанскага атрада. На зборы аднагалосна вырашылі арганізаваць партызанскі атрад. Камандзірам атрада абралі Еўдакімава І.Р.



Атрад імя Катоўскага працягваў праводзіць баявыя заданні. Але раптам гестапаўцы напалі на след сувязнога Будзька

*Сяргея Іосіфавіча жыхара нашай вёскі. Фашысты збівалі яго ў прысутнасці жонкі і дзяцей, патрабуючы, каб ён паказаў стаянку партызан, а затым сталі пагражаць растрэлам усёй сям'і. Тады Будзька вырашыў схітраваць і казаў, што ведае, дзе партызаны, і што іх там ўсяго 4 чалавека з двума абрэзамі. У рэчаіснасці іх было 50 чалавек, пра што партызан добра ведаў. Намеснік начальніка жандарскага ўчастку ў*

*Сабакінцах з 12 жандарамі адправіўся браць "чатырох партызан". Будзька, на якога надзелі наручнікі, паказваў дарогу. Падыходзячы да зямлянак, фашысты ўбачылі ў лесе кагосьці з партызан, адкрылі стральбу, і тым самым папярэдзілі байцоў аб сваім з'яўленні. Партызаны хутка занялі абарону і сустрэлі іх дружным агнём. Шэсць гітлераўцаў, у тым ліку і іх камандзір, былі забітыя, астатнія збеглі. Пасля гэтага бою партызанамі было зменена месца стаянкі, і зроблена гэта было своечасова. На наступную раніцу сюды прыбыла каля 400 гітлераўцаў, але акрамя трупаў жандараў, яны нічога не знайшлі. Будзька застаўся жыць і ўступіў у атрад Еўдакімава. Сям'я яго таксама змагла пазбегнуць расправы і сышла ў лес.*



